3. ПСЗРИ. – Собр. 3. – Т. 9. – 1889. – № 6196.
4. Страленя, А. А. Увядзенне пасады земскіх начальнікаў на тэрыторыі Беларусі і іх дзейнасць / А. А. Страленя // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 5. – С. 29–38.
5. Талмачова, С. А. Кадравая палітыка расійскага ўрада ў дачыненні да інстытута земскіх начальнікаў ў Беларусі ў пачатку ХХ ст. / С. А. Талмачова // Образование и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке. – Минск : БГПУ, 2018. – Т. 1. – С. 144–149.
6. ПСЗРИ. – Собр. 3. – Т. 32. – 1912. – № 37328.
7. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля – 5 мая 1917 г. / сост. Отд-нием Свода Законов Гос. Канцелярии. – Петроград : Государственная канцелярия, 1917. – VI, 2, 555 с.
8. НГАБ. – Ф. 1684. Воп. 1. Спр. 8.
9. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 2. 5 мая – 24 июля 1917 г. : в 2 ч. / сост. Упр-нием Кодификацион. частью. – Петроград : Государственная канцелярия, 1918. – Ч. 1. – Отд. I–VIII – VII, 799 с.
10. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 3.
11. НГАБ. – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 37.
12. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 6.
13. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 11.
14. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 1.
15. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 2.
16. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 10.
17. НГАБ. – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 5.

# ЭТНАГРАФІЧНЫЯ МУЗЕІ БЕЛАРУСІ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ І АДНАЎЛЕННЯ КАЛЕКТЫЎНАЙ ПАМЯЦІ ГРАМАДСТВА

***Д. У. Дубінін,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі,*
*УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя Максіма Танка”*

Этнаграфія даследуе культурна-бытавыя асаблівасці народаў свету ў іх гістарычным развіцці; вывучае праблемы паходжання, культурна-гістарычныя узаемаадносіны этнасаў; паказвае гісторыю іх рассялення і перамяшчэння. Арыентацыя грамадства на мінулае фарміруе яго этнічную ідэнтычнасць, якая грунтуецца на ведах пра агульнасць паходжання, вераванні, традыцыі, матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

Адной з формаў захавання і аднаўлення калектыўнай памяці грамадства з'яўляюцца этнаграфічныя музеі, якія адначасова выступаюць і ў якасці інстытута сацыяльнай памяці. Этнаграфічныя музеі адбіраюць, захоўваюць, даследуюць, экспануюць і інтэрпрэтуюць першакрыніцы ведаў пра матэрыяльную і нематэрыяльную культурную спадчыну этнасу, дакументуюць працэсы этнагенезу, побыт і культуру розных этнічных супольнасцяў [2]. У сваёй большасці этнаграфічныя музеі размешчаны у музейных будынках, пабудаваных ці спецыяльна прыстасаваных пад іх патрэбы.

Але напрыканцы XIX і ў пачатку XX стагоддзя найбольш распаўсюджанай становіцца форма этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам, якія вызначаюцца як музеі, што ствараюцца на аснове нерухомых помнікаў і архітэктурна-ландшафтных комплексаў, што ўтвараюцца помнікамі і іх прыродным асяроддзем. У якасці месца захоўвання і экспанавання такіх аб'ектаў выступае музейная тэрыторыя [3].

Музеі пад адкрытым небам ажыццяўляюць комплекснае захоўванне і дэманстрацыю побыту і культуры чалавечых супольнасцяў у натуральным асяроддзі і характарызуюцца як адна з найбольш эфектыўных формаў этнаграфічных музеяў.

Першы музей пад адкрытым небам быў ўпершыню створаны ў 1891 годзе шведскім філолагам і этнографам Артурам Хазеліусам ў Скансане, на ўскраіне Стакгольма. Канцэпцыя стварэння музея – «Швед, Пазнай сябе». У структуру музея ў Скансане ўвайшлі звезеныя туды з усіх куткоў Скандынаўскага паўвострава старадаўнія пабудовы, у тым ліку сялянскія дамы, памешчыцкія сядзібы, майстэрні, дваровыя службы, свірны, крамы, царква. Была сабрана аўтэнтычная мэбля і начынне для інтэр'ераў будынкаў. Экскурсаводы ў традыцыйных касцюмах распавядалі наведвальнікам Скансена пра традыцыи і жыццё ранейшых жыхароў дамоў, прадстаўленых у музеі. Набажэнствы і вянчанне адбываліся ў драўлянай царкве XVIII стагоддзя. Музыкі выконвалі старадаўнія мелодыі, спевакі спявалі старадаўнія песні, танцоры танцавалі нацыянальныя танцы.

Рамеснікі выраблялі традыцыйныя прадметы хатняга ўжытку прама на вачах наведвальнікаў. У 1911 годзе ў музеі адкрываецца тэатр пад адкрытым небам, а ў 1930 – пляцоўка для народных танцаў.

Мадэль, рэалізаваная Артурам Хазеліусам у Скансане, стала сусветна папулярнай. Падобныя музеі з'явіліся ў Нарвегіі, Фінляндыі, Даніі, Германіі, Галандыі. Да 1990 года ў Еўропе налічвалася амаль 2 тысячы такіх музеяў. У Расіі ад 1950 па 1990 гг. іх з'явілася больш за 100.

З’явіліся такія музеі пад адкрытым небам і ў Беларусі. Этнаграфічныя музеі пад адкрытым небам ў нашай краіне актыўна ўдзельнічаюць у перадачы культурных, нацыянальных традыцый, збіраючы артэфакты і захоўваючы жывое рамяство або ўменне вытворчасці артэфакта. У гэтых музеях можна даведацца пра традыцыі і побыт беларускага народа, прыняць удзел у спрадвечных абрадах, паслухаць фальклорныя песні і навучыцца беларускім танцам, паназіраць за работай майстроў і самім зрабіць сапраўдныя беларускія рамесніцкія вырабы, пакаштаваць стравы і напіткі нацыянальнай кухні.

У адпаведнасці з класіфікацыяй, сярод этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам вылучаюць: асяроддзевыя музеі, якія захоўваюць нерухомыя аб’екты «in situ»; музеі-скансаны, дзе мадэлюецца гісторыка-культурнае асяроддзе за кошт звезеных аб'ектаў і экамузеі, дзе асяроддзе захоўваецца ў развіцці намаганнямі мясцовых жыхароў і аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны выкарыстоўваюцца па першапачатковым прызначэнні.

Такім чынам да асяроддзевага музея адносіцца музей, дзейнасць якога накіравана на музеефікацыю гісторыка-культурнага і прыроднага асяроддзя з усімі рухомымі, нерухомымі і нематэрыяльнымі аб'ектамі, а таксама людзьмі, якія насяляюць тэрыторыю і ажыццяўляюць на ёй розныя віды дзейнасці. Асяроддзевыя этнаграфічныя музеі, якія захоўваюць нерухомыя аб'екты "in situ", або сайт-музеі (ад англ. сайт-месцазнаходжанне), размяшчаюцца на месцы мінулага або сапраўднага пражывання чалавечай супольнасці і музеефікуюць сведчанні яе ладу жыцця і традыцый.

Скансан-музей, гэта музей створаны на аснове звезеных з розных месцаў помнікаў. Яго спецыфіка заключаецца ў тым, што асяроддзе мадэлюецца штучна.

Што да экамузея, то гэта музей, створаны для комплекснага забеспячэння, захаванасці, аднаўлення, вывучэння і публічнага прадстаўлення цэласных тэрытарыяльных комплексаў культурнай і прыроднай спадчыны, матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў у іх традыцыйным гістарычным асяроддзі [1].

Ідэя экамузееў атрымала развіццё ў 70-ыя гг. XX ст., зыходзячы з тэорыі комплекснага захавання этнаграфічных матэрыяльных і нематэрыяльных аб'ектаў без канфіскацыі з асяроддзя бытавання. Гэтыя музеі накіраваны, у першую чаргу, на вырашэнне надзённых сацыяльных, эканамічных, культурных праблем мясцовай супольнасці на аснове яе актыўнага ўключэння ў працу па захаванні і выкарыстанні ўсіх відаў сваёй спадчыны. Некаторыя экамузеі атрымалі назву «жывы музей», калі музейныя экспазіцыі і некаторыя формы музейнай дзейнасці ўключаны ў сучаснае асяроддзе бытавання.

У Беларусі да этнаграфічных музеяў пад адкрытым небам можна аднесці: Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо); Музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі»; гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» і інш. Ва ўсіх акрэсленых музеях сфарміравана экспазіцыя на адкрытай прасторы за кошт камбінацыі пабудоў, захаваных на месцы, звезеных і пабудаваных аб'ектаў; захоўваюцца разнастайныя аб'екты спадчыны: жылыя, грамадскія, гаспадарчыя пабудовы, гісторыка-культурнае асяроддзе.

Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», які быў створаны ў 1986 годзе, з'яўляецца асяроддзевым музеям, паколькі на яго тэрыторыі музеефікаваны помнікі міжнароднага і рэспубліканскага значэння: гарадзішча «Замэчак» (X–XI стст., летапісны Ізяслаўль), курганныя могільнікі X–XI стст., гарадзішча «Вал» з кальвінскім зборам (XI–XVII стст., заслаўскі замак), касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі (другая палавіна XVIII ст.), палацава-паркавы комплекс Пшаздзецкіх. Для шматлікіх наведвальнікаў адкрыты: музейна-выставачны этнаграфічны комплекс «Млын», які створаны ў гонар захаванага ў Заслаўі паравога млына – помніка мукамольнай вытворчасці пачатку XX ст. У комплексе ёсць таксама Хата завознікаў, свіран, кузня. Такім чынам, асноўным метадам музеефікацыі тут з'яўляецца рэканструкцыя гісторыка-культурнага асяроддзя.

Да такога тыпу музеяў, як скансан адносяцца Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо); Музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі».

Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо) – гэта музей-скансан, які ўяўляе сабой цэлую вёску з помнікаў дойлідства XVII–XX стагоддзяў. Музей размешчаны за некалькі кіламетраў ад сталіцы Беларусі, г. Мінска – паміж вёскамі Азярцо і Строчыца, таму яго часта называюць «Музей ў Азярцы», Музей «Строчыца», «Строчыцы».

Ідэя стварэння такога музея належыць вядомаму беларускаму мастаку Фердынанду Рушчыцу. Такі комплекс пад адкрытым небам ён хацеў стварыць яшчэ ў 1908 годзе, але падзеі, звязаныя з Першай і Другой сусветнымі войнамі, не спрыялі яго з'яўленню. Стварэнне беларускага музея пад адкрытым небам ў Строчыцах

пачалося ў 1976 годзе. Архітэктары, гісторыкі, этнографы вызначалі ў розных рэгіёнах Беларусі помнікі драўлянай архітэктуры, прадметы побыту, рамёстваў і промыслаў і перавозілі іх на месца музея. З 1987 года па 1994 год былі адкрыты экспазіцыі, якія прадстаўляюць архітэктуру, культуру і жыццёвы ўклад трох этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі – Цэнтральная Беларусь, Паазер'е і Падняпроўе. На сёняшні час ў музеі знаходзіцца каля 40 аб'ектаў, сярод якіх: Пакроўская царква XVIII стагоддзя, царкоўна-прыходская школа, вятрак і свіран, карчма, кузня, лазня, хаты заможных і бедных сялян. У этнаграфічным музеі дзейнічаюць выставы: «Транспартныя сродкі ў Беларусі», «Пчалярства ў Беларусі», «Беларускі лён», «Забродскія снасці», (рыбалоўства Беларусі). Традыцыйным ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту стала правядзенне нацыянальных свят і абрадаў, фестываляў і канцэртаў: Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Купалле, Восеньскі фэст, фолк-фестываль Камяніца, праект «Шэдэўры сусветнай класікі ў музеі пад адкрытым небам», Дзень музеяў. Наведвальнікі музея могуць прыняць удзел у святочных мерапрыемствах і народных забавах, у карчме пакаштаваць сапраўдныя дранікі, верашчаку, збіцень, іншыя стравы і напоі традыцыйнай беларускай кухні.

Да жывога музея пад адкрытым небам адносіцца Музейны комплекс старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Ён размешчаны за 40 км ад Мінска ў маляўнічай мясціне каля ракі Пціч у ваколіцах вёскі Дудзічы. Побач некалі знаходзіўся маёнтак знакамітага дваранскага роду Ельскіх, якія ператварылі мястэчка Дудзічы ў буйны рамесны і гандлёвы цэнтр, «сядзібу муз». Да 1800 года ў маёнтку былі дом гаспадароў, рамесныя майстэрні, драўляная царква, вятрак, тры карчмы, сад, аранжарэя, невялікі гарбарны завод. Кожны месяц у мястэчку праводзіліся кірмашы. На аснове багатай гісторыі Дудзіч з'явіўся комплекс, дзе ўзноўлены ўклад жыцця беларускага маёнтка XIX стагоддзя. Ініцыятарам стварэння музея «Дудуткі», які адкрыўся ў 1994 годзе, стаў беларускі журналіст Яўген Будзінас. У склад музейнага комплексу уваходзіць: этнаграфічная галерэя з экспазіцыяй прадметаў побыту XVIII–XX стагоддзяў, рамесны двор (салома- і лозапляценне, ткацтва), ганчарная майстэрня (музей керамікі), майстэрня цесляра, старадаўняя кузня XIX стагоддзя, сыраварня, пякарня, бровар (цэх самагонаварэння), гараж з рэтра-аўтамабілямі, вятрак галандскага ўзору (збудаваны ў 1903–1905 гг. братамі Міхаілам і Іванам Паляковымі), драўляная царква Іаана Прарока, стайня з пародзістымі конямі, поні, ішаком, заасад (каровы, авечкі, свінні, трусы, свойскія птушкі), страусіная ферма. Наведвальнікам музейнага комплексу прапануюць дэгустацыі прадуктаў мясцовай вытворчасці ў бровары (самагон, хлеб, мёд, агурок), у пякарні (свежаспечаны хлеб, 3 віды сыроў, масла) і на ветраку (сялянскі хлеб з салам). На працягу ўсяго года ў «Дудутках» праходзяць святы і фестывалі: адкрыццё і закрыццё сезона («Спадчына Ельскіх»), пленэр кавалёў, open air «Купалле», прастольнае свята Дудуткаўскага храма, фестываль славы беларускай зброі «Наш Грунвальд», фэст «Этна Млын», свята «Трох Спасаў», калядныя выставы і інш.

Багаты этнаграфічны матэрыял захоўваецца ў нашай краіне і ў «Музеі стараверства і беларускіх традыцый» (г. Ветка); музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» (в. Бездеж), які ўяўляе сабой ідэальную трыадзіную мадэль музея часу, музея прасторы, музея дзейнасці чалавека.

Веткаўскі музей народнай творчасці быў створаны ў 1978 годзе на аснове асабістай калекцыі Фёдара Шклярава – выхадца з мясцовага стараверскага роду, самадзейнага мастака і калекцыянера даўніны. Пастаянная экспазіцыя адкрылася ў 1987 годзе ў адрэстаўрыраваным і рэканструяваным гістарычным будынку – доме купца Грошыкава. Цяпер у экспазіцыі Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый імя Ф.Р.Шклярава больш за 10 тысяч аб'ектаў, якія прадстаўляюць гісторыю і культуру стараверскай і праваслаўнай беларускай вёскі: старадаўнія і стараверскія абразы, рукапісныя і старадрукаваныя кнігі XVI–XIX стагоддзяў, зборы службовых малюнкаў і прарысовак іканапісцаў XVII–XX стагоддзяў, калекцыі вырабаў, створаных з дапамогай унікальнага мастацкага метаду – шыцця залатымі ніткамі, бісерам і жэмчугам, калекцыя хатніх упрыгажэнняў (у тэхніцы разьбы) XIX–XX стст, калекцыя рытуальных ручнікоў, археалагічныя знаходкі, народныя касцюмы. Беларускія стараверы стваралі рукапісныя кнігі з цудоўнымі мініяцюрамі і арнаментам, па-майстэрску пісалі абразы. У калекцыі музея ёсць рарытэты Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца. У зале Веткаўскага музея «Жывое рамяство» госці могуць азнаёміцца з традыцыямі і сакрэтамі беларускага ткацтва.

Адной з разанавіднасцяў этнаграфічных музеяў з'яўляецца экамузей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» і музей ў вёсцы Заброддзе.

Музей народнай творчасці «Бездзежскі фартушок» адкрыўся ў 1999 годзе ў вёсцы Бездзеж, гісторыя якой налічвае больш за 600 гадоў. Гэтая беларуская вёсачка славіцца сваімі беласнежнымі ільнянымі фартухамі, для стварэння якіх майстрыхі збіралі лен ў строга вызначаны час і пераўтваралі яго ў вельмі тонкую пражу. Амаль што 300 нітак павінна было прайсці праз заручальны пярсцёнак. Асаблівай чыстаты і белага колеру палатна майстрыхі дасягалі з дапамогай мясцовых сакрэтаў, а потым гатовыя фартухі расшывалі сімвалічнымі ўзорамі.

Музей «Бездзежскі фартушок» уключае багатую калекцыю старадаўніх фартухоў і іншых прадметаў нацыянальнага адзення, ручнікоў. Знаёмства з рамяством і традыцыямі народнай моды часта суправаджаецца гульнямі і спевамі мясцовых народных калектываў. У Бездзежы можна ўбачыць рэдкі танец на вілах

«Мікіта». Пры музеі адкрыты падворак «Каля Плэса», які ўяўляе сабой сапраўдны сялянскі дом, дзе адноўлены побыт жыхароў палескай вёскі. На Вялікдзень у Бездзежы праходзіць унікальны вясновы абрад «Стрэлка».

Унікальны экамузей пад адкрытым небам створаны ў вёсцы Забродздзе на беразе ракі Нарачанка, дзе стагоддзе таму праходзіла лінія фронту Першай сусветнай вайны. Сям'я беларускага мастака і краязнаўца Барыса Цітовіча стварыла ў Забродздзі першы ў Беларусі музей гісторыі Першай сусветнай вайны, які захоўвае больш як 2000 экспанатаў: абмундзіраванне і зброю, процівагаз, дакументы і фатаграфіі, прадметы быту салдат і асабістыя рэчы ў памяць аб блізкіх; музей рэтра-аўтамабіляў, дзе сабраны рарытэты 30–90-х гадоў XX стагоддзя, экспазіцыю матацыклаў і веласіпедаў; музей побыту стогадовай даўнасці (старадаўняя мэбля, ручнікі, адзенне, посуд, музычныя інструменты, фота); кузню і лазню, якой ужо два стагоддзі; творчыя майстэрні мастака і рэжысёра тэатра лялек. На беразе ракі знаходзіцца драўляная Барысаглебская капліца ў памяць аб усіх загінулых у ваенных дзеяннях, пабудаваная ў стылі XVI–XVII стст.. Таксама сярод самых шануемых мясцін Забродздзя і наваколля – лазарэтныя могілкі часоў Першай сусветнай вайны і 6-метровы крыж на пахаванні паблізу ваеннага лагера.

Для паўнаты карціны трэба згадаць таксама, што ў Беларусі існуе шмат музеяў не этнаграфічнага профілю, у калекцыях і экспазіцыях якіх таксама ўключаны этнаграфічныя матэрыялы.

## 🕮 БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Пронина, С. А. Методика фондовой деятельности в этнографических музеях под открытым небом / С.А. Пронина, Т. И. Кимеева // Вестник Томского государственного университета. Культурология и искусствоведение. – 2016. – № 3. – С. 187–197.
2. Сотникова, С. И. Музеология: пособие для вузов / С. И. Сотникова. – М. : Дрофа, 2004. – 192 с.
3. Станюкович, Т. В. Этнографическая наука и музеи / Т. В. Станюкович. – Л. : Наука, Ленинградское отделение, 1978. – 286 с.
4. Стефаненко, Т. Г. Этнопсихология: практикум: учебное пособие для студентов вузов / Т. Г. Стефаненко. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 208 с.


# МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX СТ.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ


***А. П. Жытко,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі*
*УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"*

***С. А. Талмачова,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі*
*УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"*


Унутрыпалітычны крызіс у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. прывёў да аслаблення дзяржавы. Гэту сітуацыю ў сваіх інтарэсах скарысталі памежныя з ёй манархіі – Расійская, Аўстра-Венгерская і Пруская. У выніку трох падзелаў (1772, 1793, 1795 гг.) Рэчы Паспалітай з карты Еўропы знікла вялікая дзяржава. Праблема Польшчы на працягу XIX – пачатку XX ст. была краявугольнай у знешнепалітычных стасунках еўрапейскіх краін.

Да Расійскай імперыі была далучана сучасная тэрыторыя Беларусі. Разам з тым праблема новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання края і стварэння новых органаў улады і кіравання практычна не з'яўлялася прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. У той жа час літаратура па гісторыі саміх падзелаў Рэчы Паспалітай і іх наступствах даволі багатая. У дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі ў якасці галоўнага канцэптуальнага палажэння выступаў пастулат аб непазбежнасці, заканамернасці і справядлівасці далучэння беларускіх, украінскіх і літоўскіх зямель у склад Расійскай імперыі. У прыватнасці, у сваёй шматтомнай працы «История России с древнейших времен» С. Салаўёў разглядаў падзенне Польшчы з пазіцыі нацыянальна-дзяржаўнага інтарэсу Расіі. С. Салаўёў падрабязна прааналізаваў першы падзел 1772 г. у сваёй манаграфіі «История падения Польши», прычыну якога ён выводзіў з унутранай шляхецкай анархіі, а далучэнне зямель ВКЛ да імперыі лічыў перамогай верацярпімасці над польскім фанатызмам [1, с. 582].